УСТАНОВА “БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АРХІЎ-МУЗЕЙ ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА”

# ГАМОЛКА МІКАЛАЙ ІВАНАВІЧ

ПІСЬМЕННІК

11 САКАВІКА 1922 – 3 МАЯ 1992

ФОНД № 279

ВОПІС № 1

1943 – 1991

МІНСК 2016

# ЗМЕСТ

**да воп. № 1** **ф. 279**


| №№ | Назва раздзелаў | № спраў | № стар. воп. |
|---|---|---|---|
| | ПРАДМОВА | | |
| 1. | РУКАПІСЫ М.І. ГАМОЛКІ | 1 - 51 | 1 - 5 |
| 1.1. | РАМАНЫ | 1 - 9 | 1 |
| 1.2. | АПОВЕСЦІ | 10 - 25 | 1 - 3 |
| 1.3. | П'ЕСА, АПАВЯДАННІ, НАРЫСЫ, ВЕРШЫ | 26 - 36 | 3 - 4 |
| 1.4. | АРТЫКУЛЫ | 37 - 46 | 4 - 5 |
| 1.5. | ВЫСТУПЛЕННЕ, РЭЦЭНЗІІ, АЎТАБІЯГРАФІЯ, ПЕРАКЛАДЫ | 47 - 51 | 5 |
| 2. | ПЕРАКЛАДЫ ТВОРАЎ М.І. ГАМОЛКІ | 52 - 54 | 5 - 6 |
| 3. | ПЕРАПІСКА | 55 - 78 | 6 - 8 |
| 3.1. | ПІСЬМЫ М.І. ГАМОЛКІ | 55 - 60 | 6 |
| 3.2. | ПІСЬМЫ ДА М.І. ГАМОЛКІ | 61 - 78 | 6 - 8 |
| 4. | ДАКУМЕНТЫ ПРА М.І. ГАМОЛКУ | 79 - 84 | 8 |
| 5. | ВЫЯЎЛЕНЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ | 85 - 93 | 9 |

## Прадмова

**Мікалай Іванавіч Гамолка** нарадзіўся 11.03.1922 г. у в. Брынёў Петрыкаўскага раёна Гомельскай вобласці ў сялянскай сям'і. У 1927 г. сям'я пераехала ў в. Найда Жыткавіцкага раёна Гомельскай вобласці. Там вучыўся ў пачатковай школе, 5-7 класы – у в. Брынёў, 8 клас – у г. Бабруйску. Завяршаць вучобу давялося ў г.п. Жыткавічы. Першыя творы друкаваліся ў абласных і рэспубліканскіх газетах. У 1939 г. паступіў у БДУ на філалагічны факультэт. Восенню 1940 г. быў прызваны ў армію і накіраваны ў часць хімабароны, дзе праслужыў да 1946 г. Напачатку быў салдатам, потым атрымаў лейтэнанцкае званне і стаў камандзірам. У гады Вялікай Айчыннай вайны М.І. Гамолка напісаў шмат вершаў, друкаваў іх у часопісе "Беларусь" і аднайменным альманаху, які выдаваўся ў Маскве пад рэдакцыяй П.Ф. Глебкі. У 1947 г. паступіў на працу рэдактарам у Дзяржаўнае выдавецтва БССР, у 1948 – 1949 гг. – літсупрацоўнік рэдакцыі газеты "ЛіМ", з 1949 г. загадваў аддзелам літаратуры і мастацтва газеты "Чырвоная змена". Завочна вучыўся ў БДУ з 1948 па 1952 гады. У 1951 – 1962 гг. працаваў адказным сакратаром часопіса "Бярозка", з 1967 г. – адказным сакратаром камісіі па Дзяржпрэміях БССР пры Савеце Міністраў БССР. У 1970 – 1979 і 1982 – 1986 гг. – літаратурны кансультант СП БССР, у 1980 – 1982 гг. – дырэктар Бюро прапаганды мастацкай літаратуры СП БССР.

Памёр М.І. Гамолка 03.05.1992 г.

Першыя вершы Мікалая Іванавіча Гамолкі былі надрукаваны ў 1937 г. у бабруйскай газеце "Камуніст". У 1946 г. стаў членам СП БССР. Аўтар зборнікаў вершаў "Зварот шчасця" (1946) і "Б'юць куранты"(1950). Выйшлі аповесці для дзяцей "Лета ў Калінаўцы"(1950, дапоўненае выданне ў 1956), "Добры дзень, школа!" (1953), "За вялікую трасу" (1954), "Лясная крэпасць" (1980), "Сокалы - сакаляты" (1987), "Партызанскія сёстры" (1989), раман "Шосты акіян" (1959), зборнік апавяданняў "Шлях адкрыты" (1960). На рускай мове выдаў аповесць "Девушка шла по войне" (1972). У 1982 – 1983 гг. выйшлі Выбраныя творы ў 2 тамах. Напісаў п'есу "Бітва ў космасе" (пастаўлена ў ТЮГ у 1963 г.) Пераклаў на беларускую мову п'есу - казку Я. Шварца "Чырвоная шапачка" (пастаўлена ў ТЮГ у 1967 г.).

Дакументы М.І. Гамолкі паступалі ў БДАМЛМ ад самога пісьменніка з 1983 г. па 1989 г. У выніку навукова – тэхнічнай апрацоўкі быў складзены вопіс № 1, было сфарміравана 93 справы (579 дак.) за 1943 – 1991 гг.

Вопіс складаецца з 5 раздзелаў.

1. Раздзел "Рукапісы М.І. Гамолкі" мае 5 падраздзелаў, сфарміраваных па жанрах, а ўнутры жанраў – па храналогіі.

1.1. У падраздзел увайшлі раманы: “Шосты акіян”, “Зямля пад бомбамі”, “Люблю і ненавіджу”, “Голуб у акне” за 1955 – 1989 гг.

1.2. У падраздзеле змешчаны аповесці “Лета ў Калінаўцы”, “Девушка шла по войне”, “Лясная крэпасць”, “Сокалы - сакаляты”, “Партызанскія сёстры” за 1956 – 1989 гг.

1.3. Падраздзел склалі: п’еса “Бітва ў космасе”, апавяданні “Дзед Талаш”, “Луста хлеба”, “На Петином дворе”, “Перад навальніцай”, “Сустрэча на Капры” і інш.; вершы, вершаваныя казкі за 1943 – 1983 гг.

1.4. Падраздзел сабраў па тэматыцы артыкулы М.І. Гамолкі за 1946 - 1983 гг.

1.5. Падраздзел уключае: выступленне М.І. Гамолкі на злёце юных пісьменнікаў Мінскай вобласці, рэцэнзіі на творы П.Ф. Глебкі, Д.М. Кавалёва, А.Г. Русака і інш., на спектаклі тэатра імя Я. Купалы па п’есе Д. Шчаглова “Пабег”, Ленінградскага драмтэатра імя Ленінскага камсамола па п’есе Ш. Дадзіякі “З іскры…” і інш., аўтабіяграфія “Мой шлях”, пераклады М.І. Гамолкі вершаў А. Калгана і У.Я. Харытонава з чувашскай мовы на беларускую (1947 - 1991)

2. У раздзеле сабраны ўрыўкі з аповесцяў М.І. Гамолкі ў перакладзе П.С. Кабзарэўскага , М. Гелера з беларускай мовы на рускую, а таксама вершы ў перакладзе П. Валкадаева і Ю.І. Назарэнкі на рускую і ўкраінскую мову (1954 - 1983).

3. Раздзел “Перапіска” мае два падраздзелы.

3.1. У падраздзел увайшлі пісьмы М.І. Гамолкі да П.С. Кабзарэўскага, Р.Р. Куленіча, Б.В. Ляпунова, М.Ф. Шаўлоўскай, У.І. Шаўчэнкі і інш. (1954 – 1986).

3.2. У падраздзеле знаходзяцца пісьмы да М.І. Гамолкі: М.Я. Аўрамчыка, В. Віткі, Л.І. Доўкшы, М.У. Долатцавай, П.С. Кабзарэўскага, К.Ц. Кірэенкі, У.І. Краўчанкі, Р.Р. Куленіча, Б.В. Ляпунова, М.Ф. Мусіенкі, У.В. Пігулеўскага, Л.І. Ракоўскага, С.А. Родава, К.І. Сямёнава, І.С. Чамякова, У.І. Шаўчэнкі і інш. (1944 - 1988)

Асобную групу падраздзела складаюць пісьмы рэдакцый газет “Советская молодёжь” (Рыга), “Комсомольское племя” (Кіраў), часопісаў “Уральский следопыт”(Свярдлоўск), “Дружба народов” (Масква), выдавецтваў: Дзяржкамвыд БССР, “Молодая гвардия” (Масква), “Веселка” (Кіеў). (1955 - 1984).

Улічваючы нязначную колькасць біяграфічных дакументаў, яны змешчаны ў канцы раздзела 3 асобнай групай (1963 - 1986).

4. Дакументы пра М.І. Гамолку сістэматызаваны па жанрах. Гэта рэцэнзіі на зборнікі вершаў , раманы, аповесці М.І. Гамолкі, артыкулы пра яго і з упамінаннем, інтэрв’ю з ім. (1946 - 1988)

5. Невялікі раздзел склалі фатаграфіі М.І. Гамолкі, індывідуальныя, з роднымі, з А.С. Васілевіч, В. Віткам, С.І. Грахоўскім, І.П. Мележам, М. Танкам, М.І. Татурам, Я.І. Янішчыц і інш. за 1946 – 1986 гг.

Прадмову склала
вяд. архівіст Евенка І.А.
17.02.2016

ПРАТАКОЛ ЭМК №__________

ад "_____"____________20____ г.

ЗАЦВЯРДЖАЮ:

Дырэктар БДАМЛіМ

______________ Г.В.Запартыка

"_____"____________20____ г.

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | **1. РУКАПІСЫ М.І. ГАМОЛКІ** | | | | |
| | **1.1. РАМАНЫ** | | | | |
| 1 | "Шосты акіян". Раман. Урыўкі з другой кнігі рамана "Цытадэль неба".<br>Аўтограф | 1955-1956 | 46 | 1 | |
| 2 | "Зямля пад бомбамі". Раман. Пачатак.<br>Аўтограф | 1956 | 74 | 1 | |
| 3 | "Зямля пад бомбамі". Раман. Заканчэнне.<br>Аўтограф, машынапіс | 1956 | 61 | | |
| 4 | "Люблю і ненавіджу". Раман. Пачатак.<br>Аўтограф, машынапіс | 1956-1989 | 93 | 1 | |
| 5 | "Люблю і ненавіджу". Раман. Заканчэнне.<br>Аўтограф | 1965-1989 | 62 | | |
| 6 | "Голуб у акне". Раман. Пачатак.<br>Аўтограф | 1987 | 85 | 1 | |
| 7 | "Голуб у акне". Раман. Працяг.<br>Аўтограф | 1987 | 60 | | |
| 8 | "Голуб у акне". Раман. Заканчэнне.<br>Аўтограф | 1987 | 75 | | |
| 9 | "Шосты акіян", "Люблю і ненавіджу". Урыўкі з раманаў.<br>Выразкі з газет | 1957-1979 | 5 | 2 | |
| | **1.2. АПОВЕСЦІ** | | | | |
| 10 | "Лета ў Калінаўцы". Аповесць.<br>Аўтограф | 1956 | 71 | 1 | |
| 11 | "Девушка шла по войне". Аповесць. Кніга другая. Няпоўны тэкст.<br>Аўтограф | 1980 | 125 | 1 | |
| 12 | "Лясная крэпасць"="Рабінзоны Князь-возера". Аповесць.<br>Аўтограф | 1980 | 109 | 1 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| 13 | "Сокалы-сакаляты". Аповесць. Варыянт. Пачатак. Аўтограф | 1983 | 101 | 1 | |
| 14 | "Сокалы-сакаляты". Аповесць. Варыянт. Заканчэнне. Аўтограф | 1983 | 77 | | |
| 15 | "Сокалы-сакаляты". Аповесць. Пачатак. Варыянт. Машынапіс. З прыпіскай аўтара ад 24.03.1986 г. | 1984 | 95 | 1 | |
| 16 | "Сокалы-сакаляты". Аповесць. Працяг. Варыянт. Машынапіс | 1984 | 104 | | |
| 17 | "Сокалы-сакаляты". Аповесць. Заканчэнне. Варыянт. Машынапіс з нязначнай аўтарскай праўкай | 1984 | 144 | | |
| 18 | "Сокалы-сакаляты". Аповесць. Урыўкі. Аўтограф, машынапіс з аўтарскай праўкай | 1986,1987 | 27 | 2 | |
| | * * * | | | | |
| 19 | "Нявольнікі Буян-возера", "Тайна крынічнага возера" і інш. Урыўкі з аповесцяў "Лета ў Калінаўцы", "Лясная крэпасць", "Сокалы-сакаляты". Выразкі з часопіса і газет | 1955-1980 | 12 | 5 | |
| | * * * | | | | |
| 20 | "Партызанскія сёстры". Аповесць. Пачатак. Машынапіс з аўтарскай праўкай | 1988 | 121 | 1 | |
| 21 | "Партызанскія сёстры". Аповесць. Працяг. Аўтограф, машынапіс з аўтарскай праўкай | 1988 | 108 | | |
| 22 | "Партызанскія сёстры". Аповесць. Заканчэнне. Машынапіс з аўтарскай праўкай | 1988 | 120 | | |
| 23 | "Партызанскія сёстры". Аповесць. Варыянт. Пачатак. Аўтограф, машынапіс з нязначнай аўтарскай праўкай | 1989 | 146 | 2 | |
| 24 | "Партызанскія сёстры". Аповесць. Варыянт. Працяг. Аўтограф, машынапіс з нязначнай аўтарскай праўкай | 1989 | 94 | | |
| 25 | "Партызанскія сёстры". Аповесць. Варыянт. Заканчэнне. Машынапіс | 1989 | 83 | | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | **1.3. П'ЕСА, АПАВЯДАННІ, НАРЫСЫ, ВЕРШЫ** | | | | |
| 26 | "Бітва ў космасе". Фантастычная п'еса.<br>Машынапіс<br>З прыпіскай аўтара ад 1985 г. | 1963 | 74 | 1 | |
| 27 | "Дзед Талаш", "Луста хлеба", "Перад навальніцай", "Сустрэча на Капры" і інш. Апавяданні.<br>Аўтограф, выразкі з газет | 1965-1981 | 29 | 7 | |
| 28 | "Золотые руки", "На Петином дворе". Апавяданні.<br>Аўтарскі пераклад з беларускай мовы.<br>Выразкі з газет | 1955,1956 | 2 | 2 | |
| 29 | "Квітнее родная сталіца наша", "Яна рассыпле хутка зоры..." і інш. Нарысы.<br>Машынапіс з аўтарскай праўкай, выразкі з газет | 1958 | 12 | 3 | |
| 30 | "Дарогі помсты", "Курганы... усюды курганы", "На фронт", "Перад растрэлам" і інш. Вершы.<br>Аўтограф, машынапіс з аўтарскай праўкай.<br>Да верша "Зварот на радзіму" прыкладзена запіска М.І. Гамолкі ад 03.1985 г. | 1943-1946 | 30 | 28 | |
| 31 | "Зямля", "Нарач", "Наша канстытуцыя", "Сяло над Прыпяццю" і інш. Вершы.<br>Аўтограф, машынапіс з аўтарскай праўкай | 1949-1984 | 25 | 22 | |
| 32 | "На каньках", "Коцік-паласаты хвосцік", "Мой дзед", "Я майструю планер" і інш. Вершы для дзяцей.<br>Аўтограф | студзень 1986 | 13 | 11 | |
| 33 | "Кот і сарокі", "На самакаце", "Міхаська-рыбалоў", "Сярожкава раніца", "Хлеб", "Чмялі" і інш. Вершы для дзяцей.<br>Аўтограф | чэрвень 1986 | 52 | 36 | |
| 34 | "Воўк-агрэсар", "Кемлівы зайка", "Сымонкаў госць".<br>Вершаваныя казкі.<br>Аўтограф | 1986 | 19 | 3 | |
| 35 | "Калгасная восень", "Палац навукі", "Пушкіну", "Экзамен" і інш. Вершы.<br>Выразкі з газет | 1949-1988 | 25 | 36 | |
| | * * * | | | | |
| 36 | Тэксты песень "Будзе мір", "Мінску слава", "Песня беларускіх піянераў" на вершы М.І. Гамолкі.<br>Выразкі з газет і друкаванага выдання | 1948-1958 | 8 | 7 | |
| | **1.4. АРТЫКУЛЫ** | | | | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| 37 | М.І. Гамолка, Дз.М. Кавалёў. "Радасць калектыўнай працы", "Слаўнае папаўненне". Артыкулы. Выразкі з газет | 1949 | 4 | 2 | |
| 38 | "Дзецям - добрыя, высокаідэйныя кнігі", "Моя тема", "Таленавітая моладзь" і інш. Артыкулы пра пачынаючых пісьменнікаў, беларускую дзіцячую літаратуру . Аўтарызаваны машынапіс, машынапіс, выразкі з газет | 1950-1982 | 44 | 12 | |
| 39 | "Свята працы, міру, вясны", "Упэўнены крок Першамая" і інш. Артыкулы да свят Першамая, Новага году. Аўтограф, выразкі з газет | 1953-1983 | 31 | 7 | |
| 40 | "Калгасная вясна", "На берагах возера дружбы", "Наша радасць" і інш. Артыкулы пра людзей працы. Выразкі з газет | 1953-1979 | 11 | 9 | |
| 41 | "Космос и будущее", "Першая касмічная траса", "Штурм цытадэлі неба" і інш. Артыкулы пра асваенне чалавекам космасу. Машынапіс, выразкі з газет | 1957-1969 | 10 | 6 | |
| 42 | "Наш Мінск", "Сонца нашага жыцця", "Шчаслівая зямля". Артыкулы пра Беларусь. Аўтарызаваны машынапіс, машынапіс | 1968-1978 | 24 | 3 | |
| 43 | "Геній Леніна - наша сонца", "Светач нашага жыцця". Артыкулы пра У.І. Леніна. Машынапіс з аўтарскай праўкай | 1969 | 14 | 2 | |
| 44 | "Ад шчырага сэрца", "Максім Танк - публіцыст", "Пятрусь Броўка" і інш. Артыкулы пра П.У. Броўку, А.С. Грачанікава, М. Танка і інш. Аўтограф, машынапіс | 1972-1979 | 31 | 7 | |
| 45 | "Па шляхах жыцця", "Пісьменнік і грамадзянін" і інш. Артыкулы да юбілеяў М.І. Калачынскага, П.Е. Панчанкі, А.І. Якімовіча і інш. Аўтограф, выразкі з газет | 1977-1979 | 19 | 5 | |
| | * * * | | | | |
| 46 | "Адказ майму рэцэнзенту". Пісьмо-адказ А. Іванчанку на яго крытыку аповесці М.І. Гамолкі "За вялікую трасу" . Выразка з газеты | 1958 | 1 | 1 | |

**1.5. ВЫСТУПЛЕННЕ, РЭЦЭНЗІІ, АЎТАБІЯГРАФІЯ, ПЕРАКЛАДЫ**

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| 47 | Выступленне на злёце юных пісьменнікаў Мінскай вобласці.<br>Аўтограф | [1980-я гг] | 3 | 1 | |
| 48 | "Марудны рост", "Пад небам бацькаўшчыны", "У пошуках свайго голаса" і інш. Рэцэнзіі на творы П.Ф. Глебкі, Дз.М. Кавалёва, А.Г. Русака і інш.<br>Аўтограф, машынапіс, выразкі з газет | 1947-1985 | 59 | 17 | |
| 49 | Рэцэнзіі на спектаклі тэатра імя Я. Купалы па п'есе Д. Шчаглова "Пабег", Ленінградскага драмтэатра імя Ленінскага камсамола па п'есе Ш. Дадзіякі "З іскры..." і інш.<br>Выразкі з газет | 1951-1963 | 3 | 3 | |
| 50 | "Мой шлях". Творчая аўтабіяграфія.<br>Аўтограф | 1991 | 10 | 1 | |
| | *　*　* | | | | |
| 51 | А. Калган. "Радзіме".<br>У.Я. Харытонаў. "Па ільічовым запавету". Вершы. У перакладзе М.І. Гамолкі з чувашскай мовы.<br>Выразкі з газеты | 1974 | 2 | 2 | |
| | **2. ПЕРАКЛАДЫ ТВОРАЎ М.І. ГАМОЛКІ** | | | | |
| 52 | "За великую трассу". Аповесць. У перакладзе П.С. Кабзарэўскага з беларускай мовы. Урыўкі.<br>Выразкі з газеты | 1954-1956 | 7 | 4 | |
| 53 | "Журавлиный остров". Урывак з аднайменнай аповесці М.І. Гамолкі. У перакладзе М. Гелера з беларускай мовы.<br>Выразкі з газеты | 1983 | 2 | 1 | |
| 54 | "Мы люди мирные". Верш. У перакладзе П. Валкадаева з беларускай мовы.<br>"Агітатор". Верш. У перакладзе Ю.І. Назарэнкі з беларускай на ўкраінскую мову і інш.<br>Выразкі з газет | 1949-1951 | 4 | 3 | |
| | **3. ПЕРАПІСКА** | | | | |
| | **3.1. ПІСЬМЫ М.І. ГАМОЛКІ** | | | | |
| 55 | Пісьмы да П.С. Кабзарэўскага (5) (Ленінград), Б.В. Ляпунова, К.І. Сямёнава і інш. (Масква). Копіі | 1954-1957 | 16 | 14 | |
| 56 | Пісьмо да Міністра культуры БССР Г.Я. Кісялёва аб выданні яго рамана "Шосты акіян" і інш. | 1956 | 4 | 3 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| 57 | Пісьмы да М.Ф. Шаўлоўскай і інш.<br>Да пісьма М.Ф. Шаўлоўскай прыкладзена тлумачальная запіска М.І. Гамолкі ад 02.02.1989 г. | 1984-1985 | 4 | 3 | |
| 58 | Пісьмы да У.І. Шаўчэнкі. (Масква). Копіі. | 1954-1957 | 18 | 13 | |
| 59 | Пісьмы да У.В. Пігулеўскага і інш. (Латвія), Р.Р. Кулініча (Украіна) | 1955-1986 | 4 | 4 | |
| 60 | Перапіска М.І. Гамолкі з рэдакцыяй газеты "Патриот Родины" (г. Петразаводск) аб публікацыі яго аповесці "За великую трассу" у перакладзе П.С. Кабзарэўскага | 1956 | 4 | 3 | |
| | **3.2. ПІСЬМЫ ДА М.І. ГАМОЛКІ** | | | | |
| 61 | Пісьмы М.Я. Аўрамчыка, В. Віткі (3), К.Ц. Кірэенкі, У.І. Краўчанкі, М. Лужаніна, І.П. Мележа і інш. | 1944-1947 | 15 | 14 | АКД |
| 62 | Пісьмы Л.І. Доукшы (2), М.У. Долатцавай (3), Б.В. Ляпунова (6), М.Ф. Мусіенкі (4) і інш. (Масква) | 1953-1987 | 18 | 15 | |
| 63 | Пісьмы В.У. Дзюбіна. (Кішынёў) | 1954 | 3 | 2 | |
| 64 | Пісьмы П.С. Кабзарэўскага (14), Л.І. Ракоўскага (3). (Ленінград) | 1949-1958 | 18 | 17 | |
| 65 | Пісьмы П.Н. Кавалёва (2), В.А. Казько , А.П. Капусціна (3) і інш. | 1955-1989 | 8 | 8 | |
| 66 | Пісьмы, паштоўкі Р.Р. Кулініча. (Кіеў).<br>Да пісьма ад 08.04.1988 г. прыкладзена анатацыя на яго пераклад аповесці М.І. Гамолкі "Лісова фортеця" - аўтограф | 1985-1988 | 10 | 9 | |
| 67 | Пісьмы У.В. Пігулеўскага. (Рыга) | 1954-1956 | 6 | 6 | |
| 68 | Пісьмы С.А. Родава (5), К.І. Сямёнава (2) (Масква), Я.Р. Ружанскага (Свярдлоўск) | 1952-1958 | 9 | 9 | |
| 69 | Пісьмы І.С. Чамякова (Варонеж), У.І. Шаўчэнкі (35) (Масква) | 1954-1958 | 46 | 36 | |
| 70 | Пісьмы ад землякоў і знаёмых | 1956-1988 | 12 | 9 | |
| 71 | Пісьмы ад чытачоў | 1953-1983 | 31 | 21 | |
| | * * * | | | | |
| 72 | Пісьмы рэдакцый газет "Советская молодёжь" (Рыга), "Комсомольское племя" ( Кіраў), часопісаў "Уральский следопыт" ( Свярдлоўск), "Дружба народов" ( Масква) М.І. Гамолку аб супрацоўніцтве. | 1955-1982 | 6 | 5 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | Да пісьма рэдакцыі газеты "Советская молодёжь" ад 21.01.1955 г. прыкладзены водгукі чытачоў на аповесць М.І. Гамолкі "За великую трассу" | | | | |
| 73 | Пісьмы выдавецтваў: Дзяржкамвыд БССР, "Молодая гвардия" ( Масква), "Веселка" ( Кіеў) М.І. Гамолку аб супрацоўніцтве | 1979-1984 | 4 | 4 | |
| | * * * | | | | |
| 74 | Праграмы спектакляў: ТЮГа "Бітва ў космасе" па п'есе М.І. Гамолкі, рэпертуар тэатра на 1963 год (у т.л. спектакль "Бітва ў космасе"), тэатра імя Я. Коласа "Салаўіная ноч" па п'есе В.І. Яжова ў перакладзе М.І. Гамолкі з рускай мовы.<br>Да праграмы спектакля ТЮГа "Бітва ў космасе" прыкладзена фатаграфія сцэны са спектакля з удзелам Г.М. Ручымскага ў ролі Паднябескі | 1963-1970 | 6 | 4 | |
| | * * * | | | | |
| 75 | Пісьмо П.К. Пранузы і адрас курсантаў Мінскага сувораўскага вучылішча з віншаваннямі М.І. Гамолку ў сувязі з 50 - годдзем з дня нараджэння | 1972 | 2 | 2 | |
| 76 | Тэлеграмы СП БССР, рэдакцыі часопіса "Вясёлка", супрацоўнікаў Петрыкаўскай цэнтральнай бібліятэкі і інш. М.І. Гамолку ў сувязі з 60-годдзем з дня нараджэння | 1982 | 11 | 10 | |
| | * * * | | | | |
| 77 | Ганаровыя граматы рэдакцый газет "Звязда", "Піянер Беларусі", "Настаўніцкая газета", часопіса "Вясёлка" і інш. М.І. Гамолку за плённае супрацоўніцтва | 1972 | 9 | 7 | |
| 78 | Запрашэнне і мандат М.І. Гамолкі - дэлегата IX з'езда пісьменнікаў БССР | 1986 | 2 | 2 | |
| | **4. ДАКУМЕНТЫ ПРА М.І. ГАМОЛКУ** | | | | |
| 79 | Р.В. Няхай. "Творчы партрэт маладога паэта". У.М. Шахавец. "У палоне прыроды". Рэцэнзіі на зборнікі вершаў М.І. Гамолкі "Зварот шчасця", "Б'юць куранты".<br>Выразкі з газет | 1946,1950 | 4 | 2 | |
| 80 | Рэцэнзіі А.К. Клышкі, І.Ф. Кудраўцава, І.П. Шамякіна і інш. на аповесці М.І. Гамолкі "Добрай раніцы, школа", "За вялікую трасу", "Лета ў Калінаўцы".<br>Машынапіс, выразкі з газет | 1951-1983 | 14 | 10 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| 81 | Рэцэнзіі І.Я. Айзенштока, У.К. Федарэнкі, водгукі чытачоў на раманы М.І. Гамолкі "Люблю і ненавіджу", "Шосты акіян".<br>Аўтограф, машынапіс, выразкі з газет | 1956-1972 | 19 | 5 | |
| 82 | Рэцэнзіі В.У. Быкава, У.В. Гніламёдава, М.П. Парахневіча і інш. на аповесці М.І. Гамолкі "Лясная крэпасць., "Сокалы - сакаляты", двухтомнік выбраных яго твораў.<br>Аўтограф В.У. Быкава, выразкі з газет | 1978-1988 | 12 | 12 | |
| 83 | М. Скрыпка, А.Г. Якімовіч і інш. Эпіграмы на М.І. Гамолку, А.Г. Русака, І.П. Шамякіна і інш.<br>Выразкі з часопісаў і газеты | [1970-я гг] | 4 | 9 | |
| 84 | Інфармацыя, артыкулы [В]. Кажэўнікава, У.І. Шаўчэнкі і інш. пра М.І. Гамолку і з упамінаннем пра яго.<br>"Верю в разум и добро". Інтэрв'ю М. Гелера з М.І. Гамолкам.<br>Выразкі з газет | 1956-1986 | 7 | 5 | |
| | **5. ВЫЯЎЛЕНЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ** | | | | |
| 85 | Рэпрадукцыі фатаграфій М.І. Гамолкі, М.Я. Аўрамчыка, А.І. Рылько.<br>Выразка з газеты | [кан.1950-х гг] | 1 | 1 | |
| 86 | К.Н. Куксо. Шарж на М.І. Гамолку.<br>Туш | 1976 | 1 | 1 | |
| 87 | Фатаграфіі М.І. Гамолкі, індывідуальныя.<br>Арыгіналы, копіі | 1946-1986 | 20 | 20 | |
| 88 | Фатаграфіі М.І. Гамолкі з Н.І. Гамолка (жонкай), С.І. Гамолка (дачкой), І.М. Гамолка (бацькам) і інш. | 1954,1974 | 2 | 2 | |
| 89 | Фатаграфіі М.І. Гамолкі, В. Віткі, А.І. Якімовіча і інш. на сустрэчах з чытачамі | 1956-1973 | 6 | 6 | |
| 90 | Фатаграфіі М.І. Гамолкі з А.С. Васілевіч, С.І. Грахоўскім, І.П. Мележам, М. Танкам, А.С. Ставерам і інш. | 1956-1976 | 7 | 7 | |
| 91 | Фатаграфіі М.І. Гамолкі з В.У. Быкавым, А.І. Вярцінскім, Б.І. Сачанкам, М.І. Татурам і інш. | 1980-1984 | 10 | 10 | |
| 92 | Фатаграфіі М.І. Гамолкі, Б.І. Сачанкі, Я.І. Янішчыц і інш. з вайскоўцамі БВА | 1980 | 3 | 3 | |
| 93 | Фатаграфіі М.І. Гамолкі з Дз.Я. Бугаёвым, А.І. Вярцінскім, П.П. Сушко і інш. у г. Узда Мінскай | 1981 | 3 | 3 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|

вобласці

У дадзены вопіс унесена 93 (дзевяноста тры)

спраў з № 1 па № 93 , 579 дакументаў.

Вопіс склала і апрацоўку фонда зрабіла

______________________

Дакументы прынялі:

______________________

______________________

"_____"____________20____ г.